УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЧЫГРЫН ІВАН ПЯТРОВІЧ

**ЛІТАРАТУРАЗНАВЕЦ, КРЫТЫК, ПАЭТ**

**10 КРАСАВІКА 1931 Г. – 22 ЖНІЎНЯ 2006 Г.**

**ФОНД № 492**

**ВОПІС № 1**

**[кан. 1940-х]–2003 гг.**

МІНСК 2021

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 492**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ І.П. ЧЫГРЫНА | 1-22 | 1-3 |
| 1.1. | АРТЫКУЛЫ, МАНАГРАФІЯ І ІНШ. | 1-5 | 1 |
| 1.2. | ВЕРШЫ | 6-22 | 2-3 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ І.П. ЧЫГРЫНА, ПРА ЯГО І ІНШ. | 23-28 | 3-4 |
| 3. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 29-39 | 4-5 |
| | СПІС КНІГ | | |

## Прадмова

**Чыгрын Іван Пятровіч** нарадзіўся 10 красавіка 1931 г. у сялянскай сям'і ў в. Чамяры Слонімскага павета Навагрудскага ваяводства (цяпер Слонімскі раён Гродзенскай вобласці). Вучыцца пачаў у польскай школе, а потым скончыў 6 класаў Чамяроўскай сямігодкі. Сярэднюю адукацыю атрымаў у СШ №1 г. Слоніма ў 1950 г. У гэтым жа годзе паступіў на беларускае аддзяленне філфака БДУ імя У.І. Леніна. Пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1955 г. некалькі месяцаў працаваў у Дзераўноўскай СШ Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці, затым з 1955 г. да 1957 г. – завучам Яварскай СШ Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1957–1958 гг. – выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры Кракоцкай СШ Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1958–1961 гг. вучыўся ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі па спецыяльнасці "беларуская фалькларыстыка". З 1961 г. да 1991 г. – навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН Беларусі (цяпер Нацыянальная акадэмія навук Беларусі). У 1968 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Станаўленне беларускай прозы і фальклор. Дакастрычніцкі перыяд". Член СП БССР з 1988 г.

Першыя публікацыі І.П. Чыгрына з'явіліся ў 1959 г. Удзельнічаў у фальклорных экспедыцыях, даследаваў узаемадзеянне фальклору і літаратуры, у выніку чаго з'явіліся артыкулы "Часціна спадчыны народнай" (1960), "Ядвігін Ш. і фальклор" (1965), "Казкі жыцця" Я. Коласа і фальклор" (1966), "Дакастрычніцкая проза Я.Коласа і фальклор: Да пытання станаўлення жанру" (1967), "Казкі вырушылі ў свет" (1972), "Максім Гарэцкі і фальклор" (1984). Выдаў манаграфіі "Станаўленне беларускай прозы і фальклор: Дакастрычніцкі перыяд" (1971), "Проза "Маладняка": Дарогамі сцвярджэння" (1985), "Крокі: Проза "Узвышша" (1989), "Рэальнае і магчымае: проза Якуба Коласа" (1991), "Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага" (1994). Аўтар раздзелаў у калектыўных працах "Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці" (1978), "История белорусской советской литературы" (1977), "Гісторыя беларускай савецкай літаратуры" (1981). Склаў "Выбраныя творы" Ядвігіна Ш. (1976), 4-ы том Збору твораў Я. Купалы (1983), анталагічны зборнік апавяданняў пісьменнікаў "Маладняка" "Веснаход" (адбор, укладанне, уступны артыкул, каментарыі) (1987). Выдаў зборнікі вершаў: "Капеж" (1992), "Бераг" і "Трыба" (1998), "Люблю вясну" (2000), "Вынікі падсумоўваліся ў панядзелак" (2001), "Пялёсткі полымя" (2001), "Фантазіі старога дзеда" (2005). Пераклаў паасобныя вершы Ф. Цютчава, У. Сыракомлі, Я. Лучыны на беларускую мову.

Іван Пятровіч Чыгрын памёр 22 жніўня 2006 г. і пахаваны на Слонімшчыне.

Дакументы Івана Пятровіча Чыгрына паступілі ў БДАМЛМ у некалькі этапаў. Частка дакументаў была перададзена самім фондаўтваральнікам з 04.04.2003 г. да 21.04.2006 г. Пасля яго смерці, апошнюю частку 14.11.2006 г.

перадала Я.М. Кісялёва, сям’я якой апекавалася дакументнай спадчынай І.П. Чыгрына. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 39 адзінак захоўвання (75 дакументаў) за [к. 1940-х]–2003 гг.

Вопіс скаладаецца з трох раздзелаў. Першы раздзел “Рукапісы І.П. Чыгрына” ўключае два падраздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па жанрах, а ўнутры – па храналогіі за 1972–2003 гг. У першы падраздзел увайшлі артыкулы, манаграфія “Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага”, раздзелы да кніг “Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці” і інш., а ў другі – падборкі вершаў да мяркуемых зборнікаў, агульныя сшыткі з вершамі.

Другі раздзел “Дакументы да біяграфіі І.П. Чыгрына, пра яго і інш.” склалі: выдавецкая дамова на кнігу вершаў “Пялёсткі полымя” паміж МГА “Беларускі кнігазбор” і І.П. Чыгрынам, тэлеграма У.В. Карпава І.П. Чыгрыну, рэцэнзіі В.К. Гардзея, У.М. Конана, К.Р. Хромчанкі на творы І.П. Чыгрына і інш. Справы сістэматызаваны па храналогіі за 1979–2002 гг.

Трэці раздзел “Выяўленчыя дакументы” сфарміраваны з фатаграфій І.П. Чыгрына: індывідуальных, з роднымі, у групах з Э.А. Акулінbackup, Р.І. Барадуліным, В.Л. Бечыкам, Г.М. Бураўкіным, У.М. Дубоўкам, Э.С. Гурэвіч, У.С. Караткевічам, Г.В. Кісялёвым А.В. Мальдзісам, М.І. Прашковічам і інш. Справы сістэматызаваны ў невялікія тэматычныя групы і па храналогіі за 1954–[пач. 2000-х гг.].

Прадмову склала Г.Б. Багамолава
Вядучы архівіст
2021

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 15.06.2021
№ 8

ФОНД № 492
ВОПІС № 1
[к. 1940-х гг.]-2003

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ І.П. ЧЫГРЫНА** | | | | |
| | **1.1. АРТЫКУЛЫ, МАНАГРАФІЯ І ІНШ.** | | | | |
| 1 | "Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага". Манаграфія.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай і заўвагамі Р.Г. Гарэцкага, В.А. Каваленкі, К.Р. Хромчанкі | [к. 1980-х-пач. 1990-х гг.] | 228 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 2 | "Аб стылі Аляксея Кулакоўскага", "На абраным шляху (Да пытання стылю А. Кулакоўскага)". Артыкулы да мяркуемай кнігі пра стыль беларускіх савецкіх пісьменнікаў і аўтарскі часопісны варыянт гэтай працы (з заўвагамі Р.В. Шкрабы).<br>Машынапіс | [1970-я-пач. 1980-х гг.] | 80 | 2 | |
| 3 | "Беларуская проза і праблемы сучаснасці". Артыкул да кнігі "Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці".<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | [1970-я гг.] | 161 | 1 | |
| 4 | "Віленскія камунары ці Мацей Мышка і яго родапачынальнікі", "З думкай пра вечнае" і інш. Артыкулы паводле кнігі "Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага".<br>Машынапіс.<br>Прыкладзена тлумачальная запіска І.П. Чыгрына да гэтых артыкулаў (2003). Л. 73<br>Аўтограф | [к. 1980-х-пач. 1990-х гг.] | 73 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 5 | Тлумачэнні да водгукаў на рукапіс кнігі "Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага" і да рэцэнзіі В.К. Гардзея на рукапіс зборніка вершаў "Капеж".<br>Машынапіс | 1987, [к. 1980-х гг.] | 11 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 6 | "Капеж". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка. Машынапіс з аўтарскай праўкай і заўвагамі рэцэнзента В.К. Гардзея | 1992 | 92 | 1/81 | |
| 7 | "Берег". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка і анатацыя да яго. Чарнавы аўтограф, машынапіс | 1998 | 156 | 1/148 | |
| 8 | "Трыба". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка. Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай | 1998 | 138 | 1/109 | |
| 9 | "Люблю вясну". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка. Машынапіс з аўтарскімі паметамі і праўкамі | 2000 | 132 | 1/107 | |
| 10 | "Вынікі падсумоўваліся ў панядзелак". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка. Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай | 2001 | 161 | 1/142 | |
| 11 | "Пялёсткі полымя". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка. Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай | 2001 | 114 | 1/102 | |
| 12 | "Фантазіі старога дзеда". Падборка вершаў да мяркуемага зборніка. Аўтарызаваны машынапіс | 2005 | 256 | 1/222 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | "Злепак з натуры", "Ён і яна", "Месяц", "Наш век", "Памяці бацькі", "Сажалка", "Сустрэча з зубрам", "Такая прыгожая, такая прывабная...", "Усмешка" і інш. Вершы. Агульны сшытак № 1. Аўтограф | 1971-1978 | 93 | 1/225 | |
| 14 | "Аж смешна!", "Душа вырываецца з пекла...", "З мінулага", "Едуць людзі", "Ноччу пад Новы год", "Праўда", "Рамантык", "У палоне" і інш. Вершы. Агульны сшытак № 2. Аўтограф | 1979-1981 | 96 | 1/255 | |
| 15 | "Восень", "Жывеш паміж небам і зямлёю...", "Згадка пра бацьку", "Матчын клопат", "На Камароўцы", "Ручэй", "Успамін з дзяцінства" і інш. Вершы. Агульны сшытак № 3. Аўтограф | 1981-1983 | 97 | 1/213 | |
| 16 | "Былі часы...", "Каларадскія жукі", "Мерыў метры...", "То што ад яблыка хацець?", "Ужо калі быць паэтам...", "Шкадаванне", "Янка Купала" і інш. Вершы. Агульны сшытак № 4. Аўтограф | 1983-1987 | 98 | 1/235 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 17 | "Бог і чалавек", "Званкі ад родных", "Каля матчынай магілы", "Малюнак з дзяцінства", "Маці", "Не далёка і не блізка", "Пад шатамі соснаў", "Прапісная ісціна" і інш. Вершы.<br>Агульны сшытак № 5. Аўтограф | 1987-1993 | 98 | 1/238 | |
| 18 | "Аб савецкай кухні сказ", "Галодным дням і бездамоўю", "Гэта было так...", "Жыву на ўзроўні сонца", "Зайцавы пакуты", "Ніякай важнай перашкоды...", "Размовы з бацькам" і інш. Вершы.<br>Агульны сшытак № 6. Аўтограф | 1993-1996 | 97 | 1/259 | |
| 19 | "А можа мне яшчэ што свеціць...", "Аніякае такой прыкметы...", "Восеньскі эцюд", "Назад не павярнуць...", "Не было такога рання...", "Успамін з будучага", "Шэры шэраг шэрых хатаў..." і інш. Вершы.<br>Агульны сшытак № 7. Аўтограф | 1996-1997 | 96 | 1/358 | |
| 20 | "Загадка сусвету", "Заклён на ўласны лёс", "Зімовы эцюд", "Калі ў госці завітаюць", "Мы трохі ўсе беларусы...", "Страшна жыць на гэтым свеце...", "Як бы найпрасцей..." і інш. Вершы.<br>Агульны сшытак № 8. Аўтограф | 1997-2000 | 97 | 1/375 | |
| 21 | "Ад думак няма адбою...", "Гэтак з часам можа стацца...", "Жыццё канчаецца пацехай...", "...І сам я дакумент эпохі!...", "Можа крыху яшчэ пажыву...", "Навошта на свеце быць..." і інш. Вершы.<br>Агульны сшытак № 9. Аўтограф | 2000-2001 | 98 | 1/359 | |
| 22 | "Ён заняты важнай справай...", "Каханы муж у каханай жонкі...", "Крок наперад, два назад...", "Мы з табою дэмакраты...", "Напісаў усё што мог...", "Рэдактары, як трактары..." і інш. Вершы.<br>Агульны сшытак № 10. Аўтограф | 2001-2004 | 97 | 1/492 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ І.П. ЧЫГРЫНА, ПРА ЯГО І ІНШ.** | | | | |
| 23 | Запрашэнні Дома літаратара, СП БССР і інш. І.П. Чыгрыну на сустрэчу з пастановачнай групай фільма "Чужая бацькаўшчына" і інш. | 1982, 1990 | 2 | 2 | |
| 24 | Тэлеграма У.В. Карпава (Масква) І.П. Чыгрыну з просьбай выказаць пазіцыю наконт арганізацыйна-прававога статусу шэрагу выдавецтваў СП СССР | 1990 | 1 | 1 | |
| 25 | Выдавецкая дамова на кнігу вершаў "Пялёсткі полымя" паміж МГА "Беларускі кнігазбор" і І.П. Чыгрыном | 2002 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 26 | Рэцэнзія В.К. Гардзея на рукапіс зборніка вершаў І.П. Чыгрына "Капеж".<br>Аўтарызаваны машынапіс | 1987 | 7 | 1 | |
| 27 | Заключэнне У.М. Конана і рэцэнзія К.Р. Хромчанкі на рукапіс кнігі І.П. Чыгрына "Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага".<br>Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1992 | 7 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 28 | І.Э. Багдановіч. "Калі на сумныя дамы...". Верш.<br>Аўтограф | 1979 | 1 | 1 | |
| | **3. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 29 | Фатаграфіі І.П. Чыгрына, індывідуальныя | 1954-[1960-я гг.] | 7 | 7 | |
| 30 | Фатаграфіі І.П. Чыгрына, індывідуальныя | [1970-я гг.]-1986 | 7 | 7 | |
| 31 | Фатаграфіі І.П. Чыгрына, індывідуальныя | [сяр. 1990-х-пач. 2000-х гг.] | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 32 | Фатаграфіі І.П. Чыгрына з роднымі (бацькам - Пятром Іванавічам, маці - Хімай Васільеўнай, братам - Мікалаем Пятровічам і сястрой - Марыяй Пятроўнай) | [1960-я-1980-я гг.] | 2 | 2 | |
| 33 | Фатаграфіі бацькоў І.П. Чыгрына - Пятра Іванавіча і Хімы Васільеўны.<br>Арыгінал і копія | [к. 1940-х-пач. 1970-х гг.] | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 34 | Фатаграфіі І.П. Чыгрына ў групах: з аднакурснікамі С.А. Гусаком, І.І. Крамко, У. Рубінскім; з афіцэрамі запаса падчас "лагерных збораў" у войску | 1953-1956 | 3 | 3 | |
| 35 | Фатаграфіі І.П. Чыгрына ў групах з В.Л. Бечыкам, А.Л. Вераб'ём, А.К. Гардзіцкім, Э.С. Гурэвіч, У.І. Дарашэвічам,Т.М. Дасаевай, П.К. Дзюбайлам, В.П. Жураўлёвым, А.М. Курсковым, М.Р. Ларчанкам, Я.Р. Лецкам, С.М. Міско, А.М. Парэпкам, М.І. Прашковічам, Ю.С. Пшырковым, Д.І. Ральковым, | 1962-1990 | 7 | 7 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | М.М. Чарняўскім, І.Г. Чыгрынавым, А.С. Яскевічам і інш. | | | | |
| 36 | Фатаграфіі І.П. Чыгрына ў групах з Р.І. Барадуліным, Д.І. Гальмаковым, У.М. Дубоўкам, У.С. Караткевічам, А.І. Мальдзісам, М.І. Мушынскім і інш. падчас [5-га] з'езду СП БССР | [1966] | 2 | 2 | |
| 37 | Фатаграфія І.П. Чыгрына з Г.В. Кісялёвым | 1986 | 1 | 1 | |
| 38 | Фатаграфіі І.П. Чыгрына ў групах з Э.А. Акулінымм, А. Бакачом, Г.М. Бураўкіным, І.П. Леановіч, М.У. Скоблам і інш. пасля літаратурнай сустрэчы з чытачамі, прэзентацыі зборнікаў "Бераг" і "Трыба" ў "Беларускай хатцы" | [к. 1990-х-пач. 2000-х гг.] | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 39 | Фатаграфіі бацькоўскай хаты І.П. Чыгрына ў в. Чамяры Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці | [1960-я-1970-я гг.] | 3 | 3 | |

У дадзены вопіс унесена 39 (трыццаць дзевяць)

спраў з № 1 па № 39 , 75 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла
2021 г.

Г.Б. Багамолава

______________________

Дакументы прынялі:
заг. аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў

В.І. Бярэйшык

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.